# Як працаваць з вучэбным дапаможнікам

Кожны параграф пачынаецца з рубрыкі «Успомніце». Яна дазволіць вам усталяваць сувязі паміж ужо засвоеным і новым для вас матэрыялам. Рубрыка «Вучэбная задача» арыентуе на вызначэнне галоўнага ў змесце параграфа. Пасля азнаямлення са зместам вучэбнага матэрыялу вам прапануецца адказаць на пытанні і выканаць заданні, размешчаныя пасля кожнага параграфа.

У рубрыцы «Сведкі гісторыі» пададзены тэксты афіцыйных дакументаў, сведчанні, успаміны, пісьмы ўдзельнікаў і відавочцаў гістарычных падзей. Карыстаючыся рубрыкай «Гістарычны дакумент», вы зможаце пазнаёміцца і папрацаваць з дакументальнымі матэрыяламі, размешчанымі на нацыянальным адукацыйным партале.

У рубрыцы «Культурна-гістарычнае асяроддзе» асвятляецца спадчына ў духоўнай і матэрыяльнай сферах жыцця беларускага грамадства. Спасылкі на дадатковыя матэрыялы абазначаны ў тэксце параграфаў дзвюма зорачкамі (**).

Абавязковыя для засваення паняцці і тэрміны, з якімі вы знаёміцеся ўпершыню, пры першым іх згадванні абазначаны **тлустым шрыфтам** і першапачаткова тлумачацца ў тэксце параграфаў. Яны пералічваюцца пасля кожнага параграфа ў рубрыцы «Новыя паняцці і тэрміны», а ў канцы вучэбнага дапаможніка таксама падаюцца ў алфавітным парадку ў «Гістарычным слоўніку».

Гісторыю робяць людзі. Імёны і прозвішчы гістарычных асоб, прадстаўнікоў беларускай навукі і культуры, якія варта запомніць, вылучаны **тлустым шрыфтам**. Без тлумачэння іх думак і вызначэння матываў паводзін у тых ці іншых сітуацыях, характарыстыкі вынікаў дзеянняў немагчыма ўявіць спадчыну, што дасталася нам як нашчадкам. Некаторым з гістарычных асоб прысвечана рубрыка «Таленты беларусаў і перакрыжаванні лёсаў».

Храналагічныя звесткі, г. зн. даты гістарычных падзей і перыяды грамадска-гістарычных працэсаў, якія з'яўляюцца абавязковымі для запамінання, абазначаны ў тэксце параграфаў **тлустым шрыфтам**. У канцы вучэбнага дапаможніка змешчана «Храналагічная табліца», дзе гістарычныя падзеі і працэсы пададзены паслядоўна.

Картаграфічныя веды вы атрымаеце пры дапамозе картасхем на форзацах вучэбнага дапаможніка і ў яго параграфах. У найноўшай гісторыі неаднаразова адбываліся падзелы тэрыторыі Беларусі, ішло фарміраванне і ўсталяванне дзяржаўных граніц. Абавязкова знайдзіце на картасхеме месца вашага жыхарства і ахарактарызуйце становішча свайго краю ў той ці іншы час. Гэтыя звесткі спатрэбяцца на ўроках «Наш край». Да такіх урокаў вам рэкамендуецца падрыхтаваць паведамленні пра сваіх славутых землякоў, пра паўсядзённае жыццё і побыт жыхароў вашага краю.

Гісторыя — навука, якая ўвесь час развіваецца. Шмат якія з гістарычных фактаў і працэсаў яшчэ ўдакладняюцца і па-новаму асэнсоўваюцца даследчыкамі. Рубрыка «Пункт гледжання» ўтрымлівае розныя погляды на гістарычныя падзеі як іх удзельнікаў, так і навукоўцаў. Пры азнаямленні з рознымі меркаваннямі варта захоўваць

Правообладатель Издательский центр БГУ

паважлівае стаўленне да тых думак, з якімі ваша пазіцыя не супадае. Раім вам падзельнічаць у дыскусіі па спрэчных гістарычных пытаннях. Гэта дасць вам магчымасць пачуць іншых і заявіць пра сябе. Не трэба баяцца так званых «няправільных» думак. Дыскусійнае пытанне не прадугледжвае адзіна правільнага адказу.

Кожны раздзел вучэбнага дапаможніка (акрамя першага) завяршаецца ўрокам абагульнення. Да яго складзены пытанні і заданні, працаваць з якімі вы можаце выбарачна. Яны прадугледжваюць выкарыстанне пэўных прыёмаў дзейнасці. Дапамогуць вам у гэтай справе памяткі, змешчаныя ў раздзеле «Метадычныя парады».

Каб атрымаць больш поўнае ўяўленне пра гістарычныя падзеі і іх удзельнікаў, раім звяртацца да спісу рэкамендаванай навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры ў канцы вучэбнага дапаможніка. Яна спатрэбіцца вам таксама пры падрыхтоўцы паведамленняў, тэмы якіх прапануюцца на ваш выбар.

Выкарыстанне QR-кодаў дазволіць вам выканаць інтэрактыўныя заданні.

## Умоўныя абазначэнні

| | |
|---|---|
| **Заданні і пытанні** | Заданні і пытанні ў тэксце параграфа |
| **Сведкі гісторыі** | Гістарычныя крыніцы, у тым ліку сведчанні ўдзельнікаў і відавочцаў гістарычных падзей |
| **Пункт гледжання** | Погляды на гістарычныя падзеі як іх непасрэдных удзельнікаў, так і гісторыкаў-даследчыкаў |
| **Таленты беларусаў і перакрыжаванні лёсаў** | Грамадскія і творчыя дасягненні ўраджэнцаў Беларусі, гістарычных асоб, дзеячаў навукі і культуры, чый жыццёвы шлях аказаўся звязаным з Беларуссю і іншымі краінамі |
| **Культурна-гістарычнае асяроддзе** | Інфармацыя пра спадчыну ў духоўнай і матэрыяльнай сферах жыцця беларускага грамадства |
| **Месцы памяці** | Прысвечаныя гістарычным падзеям мемарыяльныя комплексы, помнікі, якія рэкамендуецца наведаць |
| **Ключавое слова** | Тэкст, у якім трэба вызначыць асноўнае паняцце (ключавое слова) і даць яму характарыстыку |


Правообладатель Издательский центр БГУ

| | | |
|---|---|---|
| | **Загадкавая карцінка** | Ілюстрацыя, што ўтрымлівае пэўную супярэчнасць, неадназначнасць ці дэманструе гістарычную пераемнасць з'явы або падзеі, якія трэба вызначыць і ахарактарызаваць |
| | **Картограф** | Заданні да картасхем у параграфах і на форзацах вучэбнага дапаможніка |
| № 1 | **Гістарычны дакумент** | Дакументальныя матэрыялы электроннага адукацыйнага рэсурсу «Гісторыя Беларусі, 1917 г. — пачатак XXI ст.», змешчанага на нацыянальным адукацыйным партале http://e-vedy.adu.by (уніз падаецца нумар дакумента) |
| | **QR-код** | Спасылкі на інтэрактыўныя заданні |

Правообладатель Издательский центр БГУ









РАЗДЗЕЛ I

# КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў РАСІІ І СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ. 1917—1921 гг.

## § 1. Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі

***Успомніце.*** **1.** У чым заключаліся нацыянальнае і аграрнае пытанні?
**2.** Якім было становішча Беларусі ў час Першай сусветнай вайны?
**3.** Што такое акупацыя?

***Вучэбная задача.*** Вызначыць сродкі вырашэння аграрнага і нацыянальнага пытанняў, якія выкарыстоўвала савецкая ўлада.

**Пераход улады ў рукі Саветаў.** Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя 1917 г. прывяла да падзення самадзяржаўя ў Расіі. Аднак буржуазным Часовым урадам не былі вырашаны галоўныя, злабадзённыя пытанні — аграрнае, нацыянальнае, аб спыненні ўдзелу Расіі ў Першай сусветнай вайне і заключэнні міру. Для Беларусі асабліва набалелым было пытанне аб міры. Насельніцтва краю пакутавала ад баявых дзеянняў і цяжару ўтрымання больш чым паўтарамільённай арміі Заходняга фронту. Салдаты, якія ў сваёй большасці былі сялянамі, мабілізаванымі (прызванымі) у расійскую армію, выказвалі незадаволенасць палітыкай Часовага ўрада, накіраванай на вядзенне вайны да канчатковай перамогі. Значная частка тэрыторыі Беларусі была акупавана германскімі войскамі.

Вясной — летам 1917 г. ва ўмовах няздольнасці Часовага ўрада вырашыць пытанні аб зямлі, вайне і міры ў Расіі нарастаў палітычны і эканамічны крызіс. У гэтай сітуацыі палітычным праціўнікам Часовага ўрада стала Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (бальшавікоў) — РСДРП(б) — на чале з У. І. Леніным. Па яго ініцыятыве быў распрацаваны курс на заваёву ўлады праз узброенае паўстанне з мэтай звяржэння Часовага ўрада. Па нацыянальным пытанні бальшавікі прызнавалі права нацый на самавызначэнне аж да стварэння імі самастойнай дзяржавы. Па аграрным



Правообладатель Издательский центр БГУ

пытанні РСДРП(б) выступала за ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і перадачу ўсёй зямлі ва ўласнасць народа.

**25 кастрычніка** (**7 лістапада** паводле новага стылю) **1917 г.** рабочыя Петраграда і рэвалюцыйна настроеныя салдаты звергліі ўладу буржуазнага Часовага ўрада. 26 кастрычніка II Усерасійскі з’езд Саветаў абвясціў савецкую ўладу ў цэнтры і на месцах. Былі прыняты гістарычныя Дэкрэты аб міры і зямлі. Прапаноўвалася неадкладна пачаць перамовы з краінамі, якія ваявалі, аб справядлівым і дэмакратычным міры без анексій і кантрыбуцый. Скасоўвалася памешчыцкая ўласнасць на зямлю без усялякага выкупу. З’езд утварыў Часовы рабоча-сялянскі ўрад — Савет Народных Камісараў (СНК) на чале з У. І. Леніным.

У выніку кастрычніцкіх падзей 1917 г. адбыўся пераход улады да Саветаў рабочых, салдацкіх, сялянскіх дэпутатаў, што стала пачаткам Кастрычніцкай рэвалюцыі.

25 кастрычніка бальшавікі Мінска атрымалі паведамленне аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе. Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, у якім пераважалі бальшавікі, абвясціў сваю ўладу ў горадзе. Па яго ўказанні з турмы былі вызвалены салдаты, арыштаваныя за выступленні супраць Часовага ўрада. З іх быў арганізаваны Першы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета.

Процідзеянне бальшавікам у Мінску аказаў Камітэт выратавання рэвалюцыі. Ён быў створаны з мэтай захавання ўлады Часовага ўрада ў перыяд Кастрычніцкага ўзброенага паўстання 1917 г. Камітэт патрабаваў перадачы яму ўлады ў горадзе і прыняў рашэнне аб увядзенні ў Мінск Каўказскай кавалерыйскай дывізіі. Перавага сіл у гэты момант аказалася на баку Камітэта. Мінскі Савет пайшоў на перамовы з Камітэтам. Але, калі ў Мінск прыбылі па-бальшавіцку настроеныя войскі і бранікраваны цягнік з Заходняга фронту, суадносіны сіл змяніліся на карысць бальшавікоў. 2 лістапада 1917 г. уладу ў Мінску канчаткова ўзяў у свае рукі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Заходняй вобласці і фронту.



Раніца ў кастрычніку. Мінск. 1917 г.
Мастак *Н. Воранаў*. 1957 г.

*Карыстаючыся рэпрадукцыяй карціны, вызначце гістарычныя падзеі, якія на ёй адлюстраваны.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Пасля звяржэння Часовага ўрада барацьбу з бальшавікамі ўзначаліла Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага расійскай арміяй, якая размяшчалася ў Магілёве. Вакол яе групаваліся царскія генералы і афіцэры, замежныя ваенныя прадстаўніцтвы. СНК накіраваў у Магілёў бальшавіцкія ўзброеныя сілы, і Стаўка была ліквідавана.




Усталяванне савецкай улады на тэрыторыі Беларусі

*Ахарактарызуйце, карыстаючыся картасхемай, асаблівасці ўсталявання савецкай улады на тэрыторыі Беларусі.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

У перыяд з 25 кастрычніка па 20 лістапада 1917 г. адбылося ўсталяванне савецкай улады на не акупаванай германскімі войскамі тэрыторыі Беларусі. Улада перайшла ў рукі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў у Віцебску (**), Гомелі, Магілёве і ў іншых гарадах Беларусі.

Ва ўмовах Першай сусветнай вайны бальшавікі дзеля выканання сваіх планаў зрабілі стаўку на салдат Заходняга фронту, якія праходзіў па тэрыторыі Беларусі. Многія знясіленыя вайной салдаты, галоўным чынам сяляне, прызваныя ў армію, са спачуваннем сустрэлі першыя дэкрэты савецкай улады аб міры і зямлі.

*Папрацуйце, выкарыстоўваючы прыём ключавога слова, са зместам гэтага абзаца і рубрыкі «Сведкі гісторыі». Звярніцеся да адпаведнай метадычнай парады на с. 178.*

Бальшавіцкія кіраўнікі ў Беларусі адзначалі, што асноўнай сваёй задачай лічылі падрыхтоўку Заходняга фронту да пралетарскай рэвалюцыі і ўзброенага паўстання, таму іх арганізацыя з прычыны блізкасці да фронту па сутнасці з’яўлялася ваеннай.

1. *Вызначце, што за падзея адлюстравана на карціне.*
2. *Удакладніце змест рубрыкі «Сведкі гісторыі», карыстаючыся выявай карціны.*



Дэкрэт аб міры. Мастак *У. Сяроў*. 1957 г.

У час кастрычніцкіх падзей бальшавікоў падтрымала асноўная частка сялян, якія разлічвалі на атрыманне зямлі памешчыкаў без выкупу ў выніку ліквідацыі памешчыцкага землеўладання. Большасць працоўных Беларусі і салдат Заходняга фронту спадзяваліся на тое, што бальшавікі створаць аднародны сацыялістычны ўрад. Ён павінен быў складацца з прадстаўнікоў усіх сацыялістычных партый — бальшавікоў, меншавікоў, эсэраў — і забяспечыць скліканне Устаноўчага сходу — парламента Расіі.

**Фарміраванне і дзейнасць органаў савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце. Пазіцыя Аблвыкамзаха па пытанні аб беларускай дзяржаўнасці.** Пасля кастрычніцкіх падзей пачалося фарміраванне адзінай структуры органаў улады

Правообладатель Издательский центр БГУ

і кіравання. З 26 лістапада 1917 г. па 2 студзеня 1919 г. на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і не акупаваных германскімі войскамі частках Віленскай, Смаленскай губерняў дзейнічаў першы вышэйшы заканадаўчы орган савецкай улады. Ён называўся Абласным выканаўчым камітэтам Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (скарочана **Аблвыкамзах**). Адным з яго кіраўнікоў са студзеня і да канца 1918 г. быў Аляксандр Фёдаравіч Мяснікоў (сапраўднае прозвішча Мяснікян) — актыўны ўдзельнік усталявання савецкай улады ў Беларусі. Кіраўніцтва Аблвыкамзаха лічыла, што нацыянальнае пытанне ў Беларусі можна вырашыць шляхам утварэння Заходняй вобласці, якая б уваходзіла як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў склад Савецкай Расіі. Такая вобласць з цэнтрам у Мінску з'явілася ў 1917 г. як часовае аб'яднанне Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. У лютым 1918 г. цэнтр вобласці быў перанесены ў Смаленск, потым у яе склад увайшла Смаленская губерня.

Кіраўнікі Аблвыкамзаха не прызнавалі існавання беларускай нацыі як самастойнай. Яны лічылі, што этнаграфічныя асаблівасці, якія аддзяляюць беларусаў ад рускіх, павінны адмерці. Па меркаванні мясцовых прадстаўнікоў савецкай улады ў Беларусі, пасля кастрычніцкіх падзей 1917 г. прыйшоў час сусветнай пралетарскай рэвалюцыі, а эпоха нацыянальных дзяржаў адышла ў мінулае. Таму Аблвыкамзах усю сваю ўвагу канцэнтраваў толькі на праблемах Заходняга фронту.

*Сфармулюйце ўласнае стаўленне да прыведзенага пункту гледжання з улікам гістарычных умоў яго з'яўлення.*

**Першыя пераўтварэнні ў грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах ва ўмовах палітыкі «ваеннага камунізму».** Адным з першых мерапрыемстваў савецкай улады было правядзенне **нацыяналізацыі** прамысловасці — перадачы прадпрыемстваў з прыватнай у дзяржаўную ўласнасць. Уводзіўся 8-гадзінны рабочы дзень. Праводзіўся ў жыццё Дэкрэт аб зямлі. Згодна з ім ліквідавалася памешчыцкае землеўладанне. Адбывалася перадача былой памешчыцкай зямлі ў распараджэнне Саветаў сялянскіх дэпутатаў як органаў дзяржаўнай улады.

Ствараліся ўмовы для вырашэння нацыянальнага пытання. Важнае значэнне ў гэтым працэсе мела «Дэкларацыя правоў народаў Расіі», якая была зацверджана СНК на чале з У. І. Леніным. У ёй абвяшчаліся роўнасць усіх народаў і права кожнага з іх на самавызначэнне і ўтварэнне самастойнай дзяржавы.

Першыя пераўтварэнні ў сацыяльна-эканамічным жыцці адбываліся ва ўмовах палітыкі **«ваеннага камунізму»**. Галоўным пры яе ажыццяўленні ў вёсцы стала ўвядзенне **харчразвёрсткі**. Яна ўяўляла сабой сістэму нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі. У адпаведнасці з ёй сяляне абавязаны былі здаваць дзяржа-



Правообладатель Издательский центр БГУ

Дэкрэт аб зямлі. Мастак *У. Сяроў*. 1957 г.



*1. Вызначце, што за падзея адлюстравана на карціне.*
*2. Якое значэнне рэалізацыя Дэкрэта аб зямлі магла мець для беларускага сялянства на не акупаваных германскімі войскамі цэнтральнай і ўсходняй частках тэрыторыі Беларусі? Пры адказе выкарыстайце рэпрадукцыю карціны.*

ве ўсе лішкі прадукцыі, у першую чаргу збожжа, дзеля забеспячэння Чырвонай Арміі і насельніцтва гарадоў. З горада ў вёску накіроўваліся харчатрады для нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі. Вельмі часта сялянам даводзілася прымусова здаваць дзяржаве не толькі лішкі, але нават жыццёва неабходныя для ўласнага спажывання сельскагаспадарчыя прадукты. Правядзенне харчразвёрсткі выклікала незадаволенасць сялянства.

Характэрнымі рысамі палітыкі «ваеннага камунізму» з'яўляліся згортванне таварна-грашовых адносін і забарона прыватнага гандлю. Для забеспячэння насельніцтва таварамі і сельскагаспадарчымі прадуктамі ўводзілася карткавая сістэма. Усталёўваліся ўсеагульная працоўная павіннасць па прынцыпе «хто не працуе, той не есць», ураўняльны прынцып аплаты працы, бясплатнасць камунальных паслуг і інш.

Такім чынам, Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. паклала пачатак новаму — савецкаму — этапу пераўладкавання беларускага грамадства. Яго задачы былі звязаны з забеспячэннем умоў для пераходу ад традыцыйнага (аграрна-рамеснага) да індустрыяльнага грамадства.

*Правядзіце дыскусію па пытанні, чаму дзень 7 лістапада (25 кастрычніка паводле старога стылю) адзначаецца ў Рэспубліцы Беларусь як агульнарэспубліканскае свята. Выкарыстайце адпаведную метадычную параду на с. 178.*

***Новыя паняцці і тэрміны***: *Аблвыкамзах, нацыяналізацыя, «ваенны камунізм», харчразвёрстка.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

** У 1918 г. ураджэнец Віцебшчыны мастак Марк Шагал (1887—1985) быў прызначаны ўпаўнаважаным па справах мастацтваў у Віцебску. Ён займаўся мастацкім афармленнем горада да першай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, маляваў палітычныя плакаты, сярод якіх, напрыклад, «Мір хацінам, вайна палацам!» і інш. У 1920 г. М. Шагал назаўсёды пакінуў Віцебск. На працягу 1937—1968 гг. ён стварыў карціну «Рэвалюцыя», якую лічыў вяршыняй сваёй творчасці. У далейшым наш суайчыннік стаў зоркай сусветнай велічыні ў мастацтве XX ст. Яго лічаць адным з трох выдатных жывапісцаў мінулага стагоддзя разам з Пабла Пікаса і Сальвадорам Далі.



*М. Шагал.* Рэвалюцыя. 1937—1968 гг.

*Папрацуйце з рэпрадукцыяй, выкарыстоўваючы прыём загадкавай карцінкі. Звярніцеся да адпаведнай метадычнай парады на с. 178.*

1. Сфармулюйце пазіцыю створанага ў Заходняй вобласці і на Заходнім фронце органа савецкай улады па пытанні беларускай дзяржаўнасці.
2. Ахарактарызуйце падыходы савецкай улады да вырашэння нацыянальнага і аграрнага пытанняў у Беларусі.
3. Вызначце, чаму палітыка «ваеннага камунізму» атрымала такую назву. Спрагназуйце, да якіх вынікаў магла прывесці падобная палітыка ў вырашэнні аграрнага пытання.



Правообладатель Издательский центр БГУ